Расписание работы библиотек города Слуцка + цветной ТВ вкладыш

КіС КУР'ЕР

26 (35) Чацвер 20 ліпеня 2000 года

Кошт 50 рублёў **Слуцкая штотыднёвая газета** Заснавана ў чэрвені 1998 года. Выдавец - рэдакцыя газеты „КІС-КУР'ЕР"

2 стар. Слуцк - Нью Васюки



У нас есть, где сыграть и в преферанс, и на бильярде. А как же обстоит дело с шахматами? Этот вопрос к С.Л.Смольговскому, президенту областной шахматной федерации.

3 стар. Вандроўка па Слуцку



Сваеасаблівым кварталам Старога места было Школішча. Яно ляжала на поўнач ад Старога замка і было абмежавана з усходу Бычком, з захаду вуліцай Капыльскай.

4 стар. Свидание с Мэри Кэй



Накануне 12 июня прекрасная половина жителей города обратила внимание на рекламные афиши. Слуцк с официальным визитом посетила косметическая компания „Мэри Кэй".

5 стар. Дела хозяйские



Дожди и настроение (мини-опрос). Как ориентироваться по ярлыкам на одежде. Нестандартные советы, или о том где может пригодиться старая газета.



Курсы валют на 20.07.00

Афіцыйны курс НБ РБ

USD - 740 руб.

Курс абмену наяўных валют ОАО БелАПБ г.Слуцка

USD - купля 975 руб.
продаж 985 руб.

25 июля – День пожарной службы

С огнём не шутим

Можно уверенно утверждать, что самые известные в народе петухи – это сказочный золотой гребешок ну и, конечно, красный петух. Сегодня мы поговорим именно о втором, а точнее, о людях, которые ему противостоят. Словом, о пожарных.



Виктор Петрович Ткачук

Возложена эта необходимая работа у нас в городе и районе на Пожарный аварийно-спасательный отряд, который называется именно так с 1 января 2000 года, и находится он в подчинении Министерства по чрезвычайным ситуациям. Как нам пояснил заместитель начальника отряда подполковник Виктор Петрович Ткачук, служат в отряде 144 человека, и делится он на три пожарные части и восемь отдельных постов, размещённых в городе и районе. Работы хватает всем, как впрочем, и техники, несмотря на то, что последний раз новые машины были получены ещё в 1985 году. Что касается людей, то их явно недостаточно. И дело здесь не в зарплате или низком престиже профессии пожарного. Просто штаты спускаются с „верха" и ничего тут не сделаешь. На отдельных постах на дежурство заступают по два человека – водитель и командир отделения, он же пожарный. В случае выезда они могут подать только один „ствол". Самая большая часть – та, что расположена в районе завода „Модуль". В карауле здесь находятся 11 человек и один из них диспетчер. Когда в прошлом году горел кинотеатр „Дружба", то выезжали на происшествие сразу пять машин, а вот людей не хватало. В летний период ситуация осложняется как с пожарами, так и с нехваткой людей. Серьёзным испытанием для слуцкого отряда был пожар на торфяниках в Гацуке, фронт которого растянулся на 16 километров, а огнём было охвачено одновременно до 1,5 тысяч гектар. К слову, это был самый крупный пожар такого рода в Беларуси. Пришлось привлекать помощь из других регионов. Были техника и люди из Минска, Молодечно, Жодино, Дзержинска. И огню пришлось отступить.

По словам нашего собеседника, труд пожарного– это работа как работа, правда, с повышенной опасностью. Никогда, к примеру, не знаешь, что находится в горящем доме. По нынешним временам люди складируют всё: и краску, и бензин, и солярку, и дополнительный баллон с газом. А горят дома и объекты в Слуцке и районе часто. Уже в этом году случилось 73 пожара. Погибли восемь человек, а сумма ущерба составила 25 миллионов 187 тысяч рублей.

Как нам сообщил инспектор государственного пожарного надзора Сергей Николаевич Воронкович, среди причин возгорания преобладают: неосторожное обращение с огнём, нарушение правил эксплуатации печей и электрооборудования. Тревожит то, что среди причин в этом году уже 12 раз назывался поджог. Вот так. В прошлом году такого не было.



Начальник караула Витольд Харлинский в боксах с техникой

А ещё слуцкий отряд, теперь как ударная сила МЧС, занимается не только пожарами. Не раз уже открывали захлопнувшиеся квартиры на верхних этажах. В Селищах приходилось вытаскивать утопленника из колодца. А недавно, на солигорском мосту, когда произошла автомобильная авария, помогали из сплющенных „Жигулей" с помощью спецоборудования вытаскивать тела погибших.

В конце разговора Виктор Петрович пожелал всем служащим слуцкого пожарного аварийно-спасательного отряда здоровья, семейного благополучия и сухих „рукавов".

Сергей Богдашич

Услуги

Тарифы "потолстели"

Случчане в августе за коммунальные услуги будут расчитываться уже по новым ценам.

Дело в том, что министерство экономики разрешило облисполкомам повысить тариф на горячее водообеспечение и отопление – не более, чем на 50%, а на вывоз твёрдых бытовых отходов не более, чем на 36%.

Промышленность

Статистика говорит

По данным городского отдела статистики, за истекшие полгода объём выпущенной продукции, а также товаров и услуг в сопоставимых ценах к первому полугодию 1999 года составил в городе Слуцке 32291229 тысяч рублей и в Слуцком районе 3240176 тысяч рублей.

Темпы роста по городу составили 101,2%, по району – 118,8%. В то же время из 16 предприятий города 6 предприятий снизили объёмы производств. Объём продукции, отгруженной в страны СНГ, составил по городу 3917060 тысяч рублей и по району 406750 тысяч рублей, в том числе в Россию – 2363592 тысячи рублей по городу и 406750 тысяч рублей по району. Причём темпы роста по поставкам в Россию по городу составили 1001,1%, а по району – 442%. Наибольший вклад внесли консервный завод, пивзавод и мясокомбинат. В дальнее зарубежье объём отгруженной продукции составил 116322 тысячи рублей по городу и 73894 тысячи рублей по району. На экспорт работало пять предприятий города и два района.

Контакты третьего сектора

Образование через игры

На семинаре „Ролевые игры в образовании", который был проведён 15 июля в Солигорске, Слуцкие „Вытокі" представлял Сергей Крутиков.

„Классно! Понятия не имел о каких-то „ролевых играх", не ожидал, что будет так интересно и поучительно. Получил неплохие знания. Полагаю, что они помогут мне и в повседневной жизни. К тому же, появились новые контакты, знакомства с молодыми коммуникабельными людьми." Таков был отзыв Сергея о семинаре сразу же в первый вечер по возвращении из Солигорска.

А для читателей „Кур'ера" добавим, что семинар проводился в рамках проекта усовершенствования деятельности региональных общественных организаций. Состоялся он благодаря совместной деятельности „Форум Сюд" (Швеция), Центра дополнительного образования „Чазения" (Заславль), гражданской молодёжной инициативы Солигорска „Капелюш" и ещё нескольких республиканских общественных организаций.

Зарплата

В среднем получаем

По данным Слуцкого городского отдела статистики, средняя зарплата по Слуцку за июнь 2000 года составила 51 601 рубль.

По отраслям показатели следующие:
связь – 61 903 рубля,
строительство – 59 539 рублей,
промышленность – 58 352 рубля,
транспорт – 54 458 рублей,
медицина – 42 158 рублей,
торговля – 39 379 рублей,
образование – 36 947 рублей,
культура – 33 993 рубля,
соцобеспечение – 26 065 рублей.

Торговля

Вероятный дефицит

Неожиданно в ряде городов Беларуси в розничной торговле исчез сахар. Наш Слуцк пока с сахаром, но ажиотажный спрос в городских магазинах очевиден.

Точно назвать причину сложно. Ясно одно, что вряд ли только большой урожай вишни виноват в этом. Хотя и не станем сбрасывать со счетов повышенный спрос, связанный с сезоном заготовки стратегических сладких запасов на зиму.

Среди других причин более серьёзной, пожалуй, выглядит жёсткое административное регулирование отпускных цен на сахар и торговых надбавок для предприятий всех форм собственности. Это связало руки как производителям, так и торговле.

Топливо

Нефтепродукты дорожают

Утверждены новые оптовые и розничные цены на нефтепродукты, которые отгружаются концерном „Белнефтехим" и реализуемые через его систему автозаправочных станций.

С 19 июля этого года цена реализации одного литра бензина А-76 установлена на уровне 263 рублей (возросла на 7,2%), АИ-92 – 358 рублей (2,9%), АИ-95 – 422 рубля (2,9%), дизельного топлива – 242 рубля (6,12%).

Последнее повышение цен на нефтепродукты было 17 июня этого года и тогда оно составило 15%.

Впереди - новая жизнь?

Будем выбирать?

Похоже, что нынешней осенью „назначенные" в Палату представителей могут уступить место избранным: Президент подписал Указ о предстоящих выборах парламентариев.

Чернила под Указом ещё, наверняка, не высохли, а в кругах тех случчан, которые не безразличны к политике, уже прикидывают количество и персоналии возможных кандидатур. Таковых, по различным данным, уже набирается около десятка. Нам не удалось только уточнить: это с „завозными" кандидатами в большую политику или без...

Так или иначе, но редакция предчувствует, что обещаний посражаться за новую жизнь людей, помочь своим избирателям будет предостаточно.

Официально

Отдел ЗАГСа информирует

Оформление расторжения браков органами ЗАГС по решению судов, вступивших в законную силу до 1 сентября 1999 года, производится только до 1 сентября 2000 года.

Собственная информация

Лёсы людскія

Люстэрка памяці

Працяг. Пачатак у №25.

Аднойчы, увайшоўшы ў пакой да Толі, я так і застыла на месцы бо тое, што я ўбачыла, адняло ў мяне і сілы, і мову. Уявіце маладога ляжачага чалавека, які праз маленькае, як абняць двума пальцамі, люстэрка глядзіць у акно, якое знаходзіцца за спінкай ложка. Я не змагла стрымаць слёз, але каб не бачыў іх Толя, выплакалася ў суседнім пакоі, а потым вярнулася назад. А хлопец, усё гледзячы ў люстэрка, гаворыць: „Ну і работнікі. Трэці дзень на адным і тым жа месцы асфальт кладуць. Вось каб я мог...". Нехта аднойчы сказаў, што „афганцы" не любяць глядзецца ў люстэрка, бо яно яскрава напамінае аб перажытым і ў знешнім выглядзе заўсёды знойдзецца адбітак мінулага, ды і сівізна як бы напамінак пра надыходзячую старасць. А вось для майго знаёмага люстэрка было той саломінкай, якая звязвала яго са светам. А тыя здаровыя, што маглі хадзіць, спяваць, працаваць, не разумелі свайго шчасця, і не разумелі іншых, і не хацелі разумець і помніць. Колькі слёз выплакала маці Толі пакуль дабілася кватэру ў Слуцку, тую, у якой яны жылі. Усё ж умовы лепшыя, чым у вёсцы, хоць вада ёсць, ды і да ўрачоў, да дапамогі бліжэй. У адзін з чарговых візітаў у гарвыканкам сустрэла Зінаіда Паўлаўна на лесвіцы такога шчаслівага чына, які ёй заявіў: „Ізноў прыйшла, старая? Дарма ходзіш. Не будзе табе ніякай кватэры. Не будзе.". Але хапіла ў маці сіл адказаць: „Мой сын амаль што жыццё паклаў з-за такіх, як ты. Я спаць буду на гэтых прыступках і нікуды адсюль не пайду, але кватэру даб'юся."

Я расказала пра Толю свайму знаёмаму з Капыля Аляксандру Макаранка. Ён таксама „афганец". Такі ж, як Анатоль, сціплы, не любіць расказваць пра службу, не хваліцца ўзнагародамі, не скардзіцца на боль пасля ранення. Саша адразу папрасіўся прыехаць і пазнаёміцца з Толем. Толькі быў угавор: ні слова пра Афган. Сустрэча адбылася. Хлопцы, як старыя знаёмыя шуткавалі адзін з аднаго, расказвалі пра юначыя праздзелкі. Рагаталі, як дзеці. Пачалі смяяцца з Толевых доўгіх валасоў. Зінаіда Паўлаўна ўсміхнулася: „Мой сын у манахі збіраецца." І мы з Сашаю прапанавалі яго падстрыгчы. Калі Саша прыпадняў Анатоля, то твар яго міжволі змяніўся і ён вачамі паказаў мне на спіну Толі. На ёй было столькі адмецін ад асколкаў, столькі шрамаў, што „жывога" месца проста не засталося. Стрыжка ўдалася нядрэнная. Калі б ведала я тады, што гэта стрыжка апошняя ў жыцці Толі... Калі мы вярнуліся з Сашам да мяне ў кватэру, выпадкова Саша паставіў на магнітафон касету, дзе былі запісаны верш „Пісьмо са шпіталя", які я прысвяціла яму і Толю. Саша не дазволіў мне выключыць магнітафон. Ён плакаў. Ён не проста плакаў, а захлёбваўся ад слёз і шаптаў толькі адно слова „дзякуй". Гэта не былі слёзы слабасці, наадварот, гэта была нармальная рэакцыя на перажытае, убачанае і растрывожаную памяць.



Анатоль Хамянок

Я ўпершыню бачыла, каб так плакаў мужчына. Плакаў, не саромеючыся сваіх слёз, за сябе і за Толю, і за іншых, бо ў слязах гэтых была ўся горыч, якой даўно пара было выліцца, каб стала хоць крышку лягчэй яго жывой і чулай душы.

Час ішоў, а я ўсё чакала адказу з Мінска і Масквы. Неяк мне на работу патэлефанаваў карэспандэнт мясцовай газеты. Праўда, я адразу падумала, што гэта няйначай як следчы з аддзела званіць. Ён такім падазроным тонам пачаў распытваць, ці ведаю я хто жыве па названаму ім адрасу, ці даўно я ведаю Толю, дзе і пры якіх абставінах мы з ім пазнаёміліся. Не раўнуючы, як на допыце. А потым сказаў, што хоча напісаць артыкул і яму трэба сустрэцца са мною і пагаварыць. І з маіх слоў будзе рыхтавацца матэрыял пра Анатоля і пра мяне. Я вельмі абуралася. Пісаць пра жывога чалавека, які не ў Амерыцы жыве, а тут, у Слуцку, побач, з чужых слоў, і проста мець яго на ўвазе, як проста вобраз героя?! Каму гэта трэба? Я адказала, што пра мяне пісаць няма чаго, а пра Толю я і сама напішу, толькі тое, што сама бачыла, і тады, калі пройдзе час. А цяпер не пісаць пра яго трэба, а дапамагчы яму практычна. А шанс пазнаёміцца з Анатолем у работніка рэдакцыі быў такі ж, як некалі ў мяне: пазваніць у дзверы кватэры і сказаць: „Добры дзень!".

А потым наступіў той самы добры дзень. Перад выхадным я пазваніла Зінаідзе Паўлаўне і яна паскардзілася, што Толя зусім нічога не есць. І ціхенька шапнула ў трубку, што яму намнога горш. На дарозе з работы я купіла для Толі суніцы, - можа, хоць ягады прыйдуцца даспадобы. А ў паштовай скрыньцы мяне ўжо чакала пісьмо з ЦК таварыства Чырвонага Крыжа, у якім гаварылася, што для Анатоля ў мінскай клініцы рыхтуецца месца і яго чакаюць у названы дзень. Цяпер памятаю, што я ад радасці нават не павіталася, калі апынулася ў кватэры, а са словамі: „Толя, хутка будзем танцаваць!" убегла да яго ў пакой. Хлопец усміхнуўся, але было відаць, што яму дрэнна і вельмі баліць. А мы з Зінаідай Паўлаўнай, канечне, спадзяваліся, што пасля Мінска Толя будзе хоць крышку сядзець. Спачатку Анатоля забралі ў слуцкую бальніцу, каб падрыхтаваць да нялёгкай дарогі на Мінск. Але ў Мінск яго суправаджала толькі маці. Нават медсястры не знайшлося ў бальніцы, каб правесці цяжкахворага за 100 км. Даедзеш, хлопец, - шчасце тваё. І ён даехаў, і прабыў там амаль тры тыдні, але ўвесь час урачы казалі, што позна, каб раней. Арганізм вельмі аслаб.

Памёр Толя ўжо дома, у той слязьмі і крывёю заслужанай кватэры на самым пачатку жніўня. На пахаванне прыйшлі ўсе: і работнікі ваенкамата, і былыя воіны-афганцы, і камсамол, і карэспандэнты. І яшчэ раз пацвердзілася, што людзі збіраюцца, калі чалавек памірае. Правесці Толю ў апошні шлях сабралася столькі случчан, колькі мог умясціць вялікі гарадскі двор. І кветак было мора, і мора слёз. А мне так хацелася, каб у той момант хоць бы адзін зразумеў, што памятаць трэба жывых і плакаць аб жывых.

І цяпер, праходзіце міма помніка, хоць на хвілінку прыпыніцеся. Ведаеце, тут увекавечаны прозвішчы маладых і мужных, якія ў свой час недажылі, недапрацавалі, недакахалі. І сёння нам за іх трэба пасняваць і дажыць, і дажаць.

Пасля пахавання Толі прыляцела пісьмо з Масквы. Праз 700 км імчала дапамога і клопат. І. А. Раманчук пісаў, што ён быў у водпуску і выязджаў з Масквы, таму ліст пра Анатоля ўбачыў толькі цяпер. Але ён рады дапамагчы земляку і ўжо чакае яго. Толькі трэба паведаміць, у які дзень сустракаць. Такі дзень на календары не быў адзначаны.

Спазніліся. Усе спазніліся.

Любоў Салаўёва

20 июля – международный день шахмат

Слуцк - Нью-Васюки

Помните у Высоцкого: "Мы сыграли с Талем десять партий – в преферанс, в очко, и на бильярде". Да, у нас есть, где сыграть и в преферанс, и на бильярде. А как же обстоит дело с шахматами? С этим вопросом мы и обратились к Семёну Лазаревичу Смольговскому, президенту областной шахматной федерации, кандидату в мастера спорта, судье национальной категории, руководителю шахматной секции Центра детского творчества.



Семён Лазаревич Смольговский

- С шахматами в городе дела обстоят неважно. На уровне области ежегодно проводится три-четыре детских и два-три взрослых турнира. А вот в городе слабовато. Чем это вызвано? Не знаю. Может негативным отношением спорткомитета, может ещё чем-то. В 1987 году, можно сказать своими руками, сделали шахматный клуб. А превратили его, не мы, чёрт знает во что, хотя он должен соответствовать своему прямому предназначению. В своё время там и соревнования проводились, в том числе и областного уровня, а сейчас? С тех пор, когда здание передали ДСО профсоюзов, шахматы в Слуцке кончились. Складывается впечатление, что шахматы никому не стали нужны, хотя инициатором их развития, безусловно, должен быть горспорткомитет. А они не заинтересованы.

- Тем не менее, есть ли сегодня какие либо достижения у слуцких шахматистов?

- В прошлом году Слуцк на области занял второе место среди взрослых, а в возрастной группе до 12 лет мой воспитанник Андрей Бабейкин дважды был чемпионом области.

- Так резерв всё-таки есть, или этот вопрос в данное время неуместен?

- Согласитесь, два-три человека - это не резерв. Ситуация такая, что когда во всём мире интерес к шахматам неуклонно растёт, у нас он с каждым годом падает. Падает общий уровень культуры – падает и интерес к шахматам. Получается, что шахматы и общее состояние интеллекта государства взаимосвязаны. Шахматы выступают своего рода барометром.



- Шахматы – это спорт или искусство?

- Сложный вопрос. Для меня шахматы – это спорт умов. Ну и, второе, то, что шахматы – это и престиж.

- Как сложилась Ваша карьера шахматиста?

- Сам я родом из Питера. Закончил в своё время Ленинградский горный институт, где и увлёкся серьёзно шахматами. По образованию – горный инженер. Работал на шахтах в Норильске, затем в Солигорске. Оттуда и перебрался в Слуцк. С 1980 года профессионально стал заниматься шахматами. Участвовал в различных турнирах. В том числе в Голландии, Дании, Германии, Польше, Румынии, Болгарии. Был неоднократным чемпионом по переписке.

- Кто, по вашему, сейчас сильнейший на планете шахматист, поскольку есть разные мнения на этот счёт?

- Безусловно, это Гарри Каспаров. За ним – Крамник и далее индиец Ананд.

- А Борис Гельфанд?

- Мы с ним близкие друзья, знаю его с 14 лет, когда он ещё был кандидатом в мастера. Бывал он и у нас в Слуцке. Очень порядочный человек, чего не могу сказать о шахматных функционерах и иже с ними. Вы знаете, какое отношение было к нему руководства республики. Борис вынужден был уехать. Сейчас, вместе с женой – бельгийкой он проживает в Израиле.

- Последний вопрос. Что Вы хотели бы пожелать любителям и профессионалам шахмат?

- Пускай Слуцк повернётся лицом к культуре, в целом, и к шахматам, в частности. Пускай хотя бы нам не мешают. А я со своей стороны буду делать всё, что смогу.

Сергей Жуков

Погляд

Не трэба мне песень блатных

Захацелася мне пашукаць на гарадскім рынку касету з запісамі беларускіх народных ці эстрадных песень. Першы шапік, пры ўваходзе, сустрэў гучнай разнагалосіцай эстраднай поп-музыкі з песняй на расійскай мове. Прадавец – маладая жанчына. Выбар касет у шапіку багацейшы. Прашу паказаць хоць адну з запісамі беларускіх песень. Адказвае, што такіх няма. Толькі рускія. Ёсць замежная эстрада – на англійскай і нямецкай мовах.

- А можа ўсё-такі знойдзеце адну нашанскую, беларускую, усё ж не на Разаншчыне жывём?

- Мужчина, я продаю то, что завозит мой хозяин. А он товар получает в Минске, там записывают песни.

Успомніліся радкі з апошніх вершаў Пімена Панчанкі: „З ласкі чыноўнікаў родная мова ў намордніку". Выходзіць, што і песня – таксама? Хоць скаргу падавай у Аб'яднаныя нацыі – на моўны генацыд.

Іду да другога шапіка, там мне прапанавалі касету „Играй гармошка" беларускага спявака Вішняка, але ў рускамоўным выкананні. У цэнтры рыначнай плошчы за доўгім сталом касеты прадавалі два баксёрскага „пакроя", мужчыны. На поўную гучнасць „запусцілі" песню „Раскинулось море широко". Мелодыя і словы кранулі маё сэрца – успомніў Балтыку, дзе калісці служыў у марфлоце. Але... мне хацелася ўбачыць касету з нашымі народнымі песнямі, якія люблю з дзяцінства, слухаў на вяселлях, ад жней у полі, на вячорках у зімовыя вечары ад жанчын, што прыходзілі да нашай бабулі з прасніцамі. Мне ж тут прапанавалі касету з блатнымі песнямі. І каб пераканаць у іх вартасці, запусцілі касету з песнямі на матэў адэскага „Кічмана". Беларускіх песень і тут не знайшлося. Абыйшоў чатыры шапікі і ўсюды прадаўцы адказвалі, што такога „тавару" няма ў продажу. Нават з запісамі папулярнага фальклорнага ансамбля „Песняры". А яны, як вядома, паюць хораша, захоўваюць да тонкасцяў наш каларыт, кранаюць душу беларускую – дык наскрозь. Але толькі ў пятым шапіку малады хлапчына паказаў касету з песнямі гэтага калектыву, праўда, з рэпертуару 70-80 гадоў. Ды і такіх касет было толькі дзве. Неўтаймаваны ніякімі „шлюзамі", як веснавая паводка, разліў падобных эстрадных шоў захліснуў не толькі рынкі і вулічныя шапікі. Прыслухайцеся да прыпаркаваных на платных стаянках і рыначнай плошчы легкавушак, пабывайце на вясельных застоллях, у групавых рэстаранных кампаніях – ужо рэдка калі пачуеш нашу народную песню, а іх знаўцамі фальклору запісана звыш 20 тысяч! На вяселлях не толькі ў горадзе, а і ў вёсцы ўжо не ўбачыш народных самабытных музыкаў – з баянам, дудкай, скрыпкамі, бубнам – паўсюдна з „калонак" гучаць рускамоўныя эстрадныя песні ў выкананні вядомых і не вельмі „зорак".



Слуцкі песняр


Што яшчэ заўважыў не раз – моладзь паступова страчвае цікавасць да фальклорна-этнаграфічных ансамбляў, дзе яшчэ жыве народная песня. Пераканаўся лішні раз у гэтым летась у час правядзення ў Слуцку восенскага кірмашу. На плошчы перад будынкам гарбібліятэкі выступаў вядомы ў раёне фальклорны ансамбль „Ячаўскія вячоркі", дарэчы, маладзёвы па ўзросту яго ўдзельнікаў, пераважна жанчын. Два гады таму яны былі на гастролях у Германіі і вярнуліся адтуль з падзякамі ад удзячных немцаў, якія любяць фальклор. А тут, дома, паслухаць „вячоркаўцаў" прыйшлі пераважна людзі пажылога ўзросту ды дзеці малыя з бабулямі і дзядулямі. Слухалі з замілаваннем, на вачах многіх я бачыў слёзы – так кранаді людзей случчанскія старадаўнія і сучасныя песні. І маладыя хлопцы і дзяўчаты паспешліва праходзілі міма, не прыпыняючы кроку. На пытанне, чаму не хочацца паслухаць тое, што ацэнена нават замяжой, дзяўчына ў модных джынсіках адказала: „Меня эти песни не трогают, всё это устарело".

І гэта не можа не трывожыць, бо калі працэс адмірання нацыянальнай культуры, асабліва ў правінцыі, мы не спынім, калі на шматлікіх маладзёвых дыскатэках будуць і далей гучаць толькі замежныя эстрадныя хіты, а ў шапіках па продажу касет – таксама, то гадоў праз дзесяць-пятнаццаць народ, які і так ужо ў большасці сваёй размаўляе на „трасянцы", канчаткова забудзе спрадвечныя, увабраўшыя багацейшыя „струны" чалавечай душы, песні. Запісы іх застануцца гэткімі музейнымі рэліквіямі – як косці вымерлых калісці мамантаў.

Міхась Александровіч

Сілуэт

Мастак эпохі барока



Троіцкі касцёл езуітаў. Рэканструкцыя Е.Пашэнды

23 ліпеня спаўняецца 310 гадоў з дня нараджэння беларускага мастака, майстра манументальнага жывапісу і іканапісца Якуба Брэтцгра (1690-1733).

Нарадзіўся мастак у Пінску. Належыў ён да вернікаў каталіцкага веравызнання. Пасля таго, як стаў манахам-езуітам, выконваў пераважна заказы па аздабленню будынкаў у рэзідэнцыях свайго ордэна. Захаваліся звесткі пра яго работу ў Полацку, Віцебску, Мінску, дзе ён ствараў алтарныя карціны ў касцёлах, залаціў алтары, пісаў абразы.

У 1715-17 і 1723-24 гадах Брэтцар працаваў у Слуцку. Калі прыгадаць, што слуцкія езуіты на працягу 1710-20-х гадоў узводзілі ў Новым месце на вуліцы Сенатарскай (Шырокай) свой кляштар з касцёлам Св.Тройцы (асвечаны ў 1715 годзе), а яшчэ на пачатку XVIII ст збудавалі ў Старым месцы (каля Востраўскай брамы) кляштар з касцёлам Св.Руха, то можна думаць, што Брэтцарам былі размаляваны і аздоблены і адзін, і другі касцёлы, сцены якіх, як сведчыць апісанне, былі пакрыты манументальным „аптычным“ жывапісам.

У параўнанні з другімі беларускімі гарадамі ў Слуцку езуіты з'явіліся значна пазней. У мастацтве яны былі носьбітамі стылю барока. Пра слуцкія езуіцкія касцёлы вядома мала, бо іх не стала ў 1-ай палове XIX ст. Сціплыя звесткі пра іх выгляд і аздабленне даносяць нешматлікія архіўныя і літаратурныя крыніцы. Можна думаць, што роспісы Якуба Брэтцара былі ці не першымі ў Слуцку значнымі манументальнымі жывапіснымі творамі, як і, магчыма, першымі значнымі творамі ў стылі барока.

Гістарычныя тапонімы горада

Вандроука па Слуцку

Працяг. Пачатак №№22, 24

Старажытныя абарончыя земляныя валы стрымлівалі пашырэнне гарадской тэрыторыі і былі прычынай скучанасці забудовы і павялічэння шчыльнасці гарадскога насельніцтва. Да канца XIX-пачатку XX стагоддзяў Слуцк па шчыльнасці насельніцтва, што прыходзілася на адзінку плошчы гарадской тэрыторыі, займаў ці не першае месца сярод гарадоў Мінскай губерніі. У XVIII ст. за гарадскімі валамі, акрамя Вострава і Трайчанаў, з'яўляюцца таксама пасяленні каля Капыльскай і Навамейскай брамаў. Пачынаючы з XIX стагоддзя горад пачынае паволі пераходзіць межы сярэдневяковых умацаванняў. Асабліва шырока засялялася мясцовасць за Навамейскай брамай, па правы бок ад дарогі, што выходзіла з горада і вяла на поўдзень. Людзі, што набывалі тут пляцы, адчувалі сябе вольна. Урадлівыя землі дазвалялі займацца земляробствам, разбіваць агароды, садзіць сады. У параўнанні са скучанасцю даўно занятай гарадской тэрыторыі сяліцца тут было выгадна. Таму, відаць, новае прадмесце і атрымала сваю назву – **ВЫГОДА.** Цяпер былая Выгода– гэта гарадская тэрыторыя ў раёне вуліцы Будаўнікоў, бальніцы і прылягаючага прыватнага жылога сектара. Тэрмін Выгода шырока ўжываўся да сярэдзіны XX ст. ён яшчэ добра вядомы карэнным слуцакам сталага веку.

У XVII і XVIII стст. у радзівілаўскім войску, гарнізон якога размяшчаўся ў Цытадэлі служыла шмат наёмнікаў – іншаземцаў. Некаторыя з іх заводзілі сем'і , сяліліся побач з крэпасцю. У XIX ст. ў раёне Цытадэлі мелі дамы для пражывання камандзіры размешчаных у горадзе рускіх войскаў. Верагодна, што размяшчэнне на ўскраіне Новага места жыхароў, многія з якіх мелі немясцовае паходжанне, было падставай для назвы гэтай тэрыторыі **КАЛОНІЯ** (Калёнія). „... Мы... вярталіся позна ўжо вечарам у свой студэнцкі інтэрнат на „Калоніі“... „ – піша, успамінаючы гады вучобы ў слуцкім педтэхнікуме у канцы 1930-х гадоў, беларуская пісьменніца Алена Васілевіч. Тэрыторыю былой Калоніі можна сёння вызначыць раёнам канца вуліцы Камсамольскай, вуліцай Вечаркевіча, месцам, дзе размяшчаюцца Гаргаз, Райаграпрамэнэрга, МБТІ і жылы сектар побач. Як і Выгода, тапонім Калонія пачаў выходзіць з ужытку пасля Айчыннай вайны.

К XVIII ст. набыў адметны выгляд і атрымаў сваю назву яшчэ адзін раён Новага места – паўночна-заходняя яго частка, што межавала з левым берагам Случы і ўпіралася ў гарадскі вал. У адрозненне ад іншых спланіраваных кварталаў і прамых вуліц Зарэчча, на гэтай больш нізменнай і забалочанай тэрыторыі людзі сяліліся ў адпаведнасці з магчымасцямі рэльефа. Таму, у параўнанні з другімі прамымі кварталамі, гэты квартал выглядаў крывым. Ад таго ён і атрымаў сваю назву – **КРЫВАСЁЛКІ**. З часам цераз гэты квартал пралягла вуліца, якую таксама назвалі Крывасёлкі. Тэрмін Крывасёлкі, магчыма, пачаў адыходзіць з ужытку яшчэ ў XIX стагодзі. Сёння гэта тэрыторыя уздоўж Случы ад маста па вуліцы М.Багдановіча да Чортавага мосціка, а старажытнай вуліцы Крывасёлкі, відаць, адпавядае цяперашняя вуліца 8 Марта.

Своеасаблівым кварталам Старога места было **ШКОЛІШЧА**. Яно ляжала на поўнач ад Старога замка і было абмежавана з усходу Бычком, з захаду вуліцай Капыльскай, а на поўначы даходзіла да вуліцы Падвальнай і гарадскога вала. З канца XVI ст. па дазволу князя гэтае месца было выдзелена для пражывання прыбыўшай у Слуцк яўрэйскай абшчыны. У яго цэнтры была ўзведзена сінагога – спачатку драўляная, а ў XIX ст. яна ўжо была мураванай. Пры сінагозе дзейнічала навучальная ўстанова – ешыва, якую часцей называлі школай. Ад таго і саму сінагогу мяшчане звалі школаю, а ўвесь квартал ад яе і атрымаў назву Школішча. Ад замка на Школішча ішла вуліца, ад пачатку званая Яўрэйскай, а ў XIX ст. перайменаваная на Школьную. Пачынаючы з XIX ст. найбольш заможныя яўрэі набывалі сабе пляцы ўжо па вуліцы Шасейнай (цяпер - Леніна), Маставой (былой Навамейскай), на Выгодзе, на Трайчанах. А Школішча ператваралася ў месца пражывання бяднейшага насельніцтва як іўдзейскага, так і хрысціянскага веравызнання. „На долю выпала мне радзіцца ў Слуцку на Школішчы“ – піша ў сваіх мемуарах адметны дзеяч беларускай эміграцыі ў Амерыцы Ян Пятроўскі. „Адрас наш быў: Бычковая вуліца №44... На нашай вуліцы было шэсць беларускіх хатаў і пяць яўрэйскіх.“

Лёс Школішча не зайздросны. У часы нямецка-фашысцкай акупацыі яно было ператворана ў гета. У 1943 годзе яго насельніцтва падвергпася знішчэнню карным эсэсаўскім батальёнам. Помнікамі тых трагічных часоў з'яўляюцца брацкія магілы на полі за горадам на поўнач ад гэтага квартала і ў гаі Гараваха каля Івані. Сёння былое Школішча – гэта тэрыторыя, занятая макароннай фабрыкай, СШ№6, прыватнай жылой забудовай і шматпавярховікамі па вул.Капыльскай і Парыжскай камуны (былой Школьнай - Яўрэйскай).



Школішча на плане Слуцка канца XVIII ст.

І. Ц.

Працяг будзе.

Архітэктурны помнік

Чыгуначны вакзал

50 гадоў таму па тыповаму праекту з цэглы, замест часовага драўлянага, быў узведзены цяперашні будынак слуцкага чыгуначнага вакзала. Яго выгляд нясе стылёвыя прыкметы савецкага мастацтва 30-50 гадоў: сіметрычнае размяшчэнне архітэктурных аб'ёмаў, у вонкавым дэкоры выкарыстаны элементы ордэрнай сістэмы.

(Гістарычны нарыс з гісторыі слуцкага чыгуначнага вакзала – у наступным выпуску МіС).



Каляровая палітра

Выстава у гарадскім музеі

Творчыя работы выпускнікоў дзіцячай мастацкай школы 2000 года экспаніруюцца ў выставачнай зале гарадскога краязнаўчага музея. Усе з дзевятнаццаці прадстаўленых аўтараў неаднойчы прымалі ўдзелы ў рознага ўзроўню выстаўках, фестывалях і конкурсах, у выніку чаго школа і асобныя ўдзельнікі адзначаны шматлікімі прызамі, дыпломамі, граматамі і іншымі ўзнагародамі.





Са сваімі работамі: Янковіч Павел (Ілюстрацыя да твора У.Шэкспіра „Кароль Лір“) і Макарэвіч Аксана („Радзівілаўскія вобразы“)

Дэкаратыўнае пано „Кветкі“ Троцкай Вольгі

...і за мяжой

У выставе „Музыка і танец“, прысвечанай 50-гадоваму юбілею Амстэрдамскага цэнтра народнага танца, што ў канцы траўня 2000 года размясцілася ў адным з самых прыстыжных культурных цэнтраў Амстэрдама, прынялі ўдзел адзінаццаць творчых дзіцячых калектываў з Расіі і Беларусі. У ліку запрошаных і Слуцкая ДМШ. З прадстаўленых 47 работ са Слуцка на выставу трапіла 11. Усяго ж на суд журы было пададзена 338 твораў, з якіх для экспазіцыі было адабрана 102. Вынікі выставы стануць вядомы пазней.

Бібліятэка

Хто летам з кнігай

Пік наведвання бібліятэкі традыцыйна прыходзіцца на час вучобы, калі асаблівую ўвагу кнізе ў перыяд сесій і перад імі аддаюць студэнты або навучэнцы школ і вучылішчаў горада пры падрыхтоўцы і вывучэнні пэўных тэмаў. Тым не менш, ужо колькі гадоў запар колькасць наведвальнікаў гарбібліятэкі не зніжаецца і летам. А ў дзіцячай нават і павялічваецца.

Калі казаць пра лічбы, то дарослы абанемент штодня мае 60-80 наведванняў, а чытальная зала не менш 20-30, часам да 50. У дзіцячы абанемент кожны дзень прыходзяць прыкладна 90 навучэнцаў 1-9 класаў, а ў чытальную залу каля 25. У дзіцячай бібліятэцы распрацавана летняя праграма, што прадугледжвае шматлікія інфармацыйныя мерапрыемствы і літаратурныя гульні, арыентаваныя пераважна на тых, хто праводзіць час у школьных лагерах.

Летам у бібліятэцы пэўны час аддаюць рабоце з фондамі, вывучэнню новай літаратуры. Асаблівы клопат цяпер – перавод фондаў ЦБС на новую табліцу бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі, якая набліжае класіфікацыю фондаў да сусветных стандартаў. Не на апошнім месцы знаходзіцца ў слуцкай ЦБС працэс камп'ютэрызацыі. Пакуль што работу з камп'ютэрамі засвойваюць самі бібліятэкары. Аднак хочацца спадзявацца, што не доўга чакаць, калі карыстацца імі ў даведачным аддзеле будуць і наведвальнікі, а сама бібліятэка з дапамогай Internet злучыцца з бібліятэкамі краіны і замежнымі.

Пакуль жа для наведвальнікаў магчымасць пазнаёміцца з навінамі літаратуры і культуры, сацыяльным і эканамічным жыццём рэгіёна дазваляюць падрыхтаваныя стэнды-выставы, сярод якіх прысвечаныя княгіні Сафіі Алелькавіч, гісторыі і культуры Случчыны, слуцкім паясам, юбілейным літаратурным датам і іншыя.

Аўтар і вядучы старонкі Ігар Ціткоўскі

Што было

Гістарычны каляндар



Сёлета спаўняецца 650 гадоў з дня нараджэння вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Вітаўта (1350-1430). Гэта быў адзін з самых выдатных дзяржаўных дзеячоў ВКЛ, у часы кіравання якога (1392-1430) краіна дасягнула свайго найвялікшага росквіту. Вітаўт праводзіў палітыку цэнтралізацыі і ўмацавання вялікакняскай улады. У барацьбе з польскай экспансіяй адстаяў незалежнасць Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Значна пашырыў яе тэрытарыяльныя межы.

У 1395 годзе Вітаўт даў свайму дваюраднаму брату князю Уладзіміру Альгердавічу ўзамен Кіеўскага княства Слуцкае. Нашчадкі апошняга - князі Алелькавічы валодалі Случчынай да 1612 года.

Красота спасёт мир

Свидание с Мэри Кэй

Накануне 12 июля жители города, а точнее будет сказать, его прекрасная половина, наверняка, обратили внимание на рекламные афиши, расклеенные почти повсеместно. Слуцк с официальным визитом посетила косметическая компания "Мэри Кэй". Что это такое и с чем его едят - нам и захотелось выяснить.

12 июля. На часах было далеко за семь вечера и мероприятие, проходившее в холле кинотеатра "Беларусь", подходило к логическому завершению. Поэтому нам без труда удалось пообщаться с теми людьми, кто, собственно говоря, и организовал данный сейшн. Наш собеседник - Лилия Нимера, Независимый Старший Лидер Бизнес-группы компании "Мэри Кэй".

- Расскажите, пожалуйста, о прошедшем сегодня мероприятии, которое привлекло немалое количество посетителей.



Лилия Нимера

- Сегодня, впервые в Слуцке, наша компания проводит рекламную акцию по представлению своей косметики. Мы изучаем спрос на нашу продукцию, но не только. Дело в том, что в маленьких городах практически никто не занимается имиджем женщины. Все хотят быть красивыми и стильными, но далеко не все имеют представление, как это сделать. Мы же оказываем подобного рода консультации и, посетившие сегодня нас дамы, могли в этом убедиться. В начале августа мы планируем повторный визит в Ваш город. А в дальнейшем, что это будет более масштабное шоу, которое, кроме всего прочего, будет включать в себя и конкурс "Мисс Слуцка". Есть намерение привлечь к будущему мероприятию свадебный салон и салон причёсок.

- Если можно, более подробно о Вашей компании.

- Компания существует уже 37 лет. Родиной её является Даллас, штат Техас, США. Создателем компании является Мэри Кэй Эш, женщина, которая создала её в возрасте 55 лет. Отличительной чертой компании является то, что в ней работают только женщины. И я считаю, что это правильно, поскольку есть такие структуры в бизнесе, в которых должны работать только женщины. Только женщины могут создать в коллективе такую дружную ауру, какую мы имеем в своей компании. Ассортимент продукции включает более 200 наименований в 9 категориях: уход за кожей лица, декоративная косметика, уход за ногтями, уход за волосами, уход за телом, средства защиты от солнца, парфюмерия, уход за кожей для мужчин. Непосредственно производство ведётся в США, Швейцарии и Китае. С 1995 года "Мэри Кэй" - торговая марка номер один в США по продаже средств по уходу за кожей и декоративной косметики.



Татьяна и Ольга - консультанты по красоте

- Как Вам понравились наши слуцкие женщины?

- Вы знаете, очень интересные женщины. Я хотела бы даже подчеркнуть, что у них настолько велик интерес ко всему новому, что они просто жаждут проведения подобных мероприятий. Мы ещё обязательно приедем. До встречи осенью.

Сергей Жуков

Из старого альбома

Мужчин нашей семьи отнимали войны и лагеря

Открывая свой семейный альбом с фотографиями из далёкого прошлого, ловлю себя на мысли, что взгляд, в первую очередь, останавливается именно на этом пожелтевшем фото.

Главой этой семьи был мой дедушка Илларион Васильевич Коханович и бабушка Екатерина Францевна, воспитавшие девятерых детей. Дедушка всю жизнь проработал гардеробщиком в Слуцкой гимназии и был отличным садоводом и цветоводом.

В военной форме - Михаил Илларионович, он прибыл на побывку с фронта в 1915 году и сфотографировался с родителями и сёстрами на память. Вернувшись на фронт в 1915 г, на руках Михаила умирает боевой генерал, адъютантом у которого он был. И выполняя волю умирающего, мой дядя женился на вдове генерала, которая жила в Ташкенте. Несмотря на большую разницу в возрасте, они прожили счастливую жизнь. Дядя воевал и на Великой отечественной войне, он вернулся после Победы и прожил 80 лет.



Фото из семейного альбома Л.Лукьянцевой

Два его старших брата Иосиф и Александр (на фото их нету) тоже воевали на фронтах гражданской войны. Александр Илларионович погиб, защищая Севастополь в начале Великой отечественной войны, а Иосиф Илларионович, тоже участник войны, после Победы работал военкомом в Рузаевке Пензенской области, и умер в 1950 году.

В верхнем ряду стоит моя тётя - Мария Илларионовна. В 1937 г. был арестован её муж, бывший священник Каранчук, который и погиб в лагерях. Всю жизнь она его ждала.

В центре фото - моя мама Анна Илларионовна Сацук. С 12 до 80 лет она пела с сестрой Марией Илларионовной в церковном хоре, имели прекрасные голоса и с 20-х годов были солистками белорусского хора. Во время войны мама была связной партизанского отряда им. Будённого, ходила "по лезвию бритвы" во время оккупации Слуцка. За заслуги перед Родиной награждена орденом Отечественной войны, тремя медалями. 50 лет прожила вдовой и умерла в 96 лет.

Отец мой Александр Тарасович Сацук погиб за три месяца до Победы, похоронен в Польше. 50 лет мы с мамой искали его могилу, но нашла три года назад. Дважды её навещала на кладбище Советских воинов в Польше. Два брата отца тоже воевали, один погиб, другой пропал без вести. До сих пор с его дочерью ищем его могилу.

Ох, эти войны! Кончатся ли они когда-нибудь? Кончит ли война собирать свою страшную долю, принося горе в семьи...

Л. А. Лукьянцева, ветеран труда

От редакции: Публикацией этого материала мы приглашаем читателей поделиться своими воспоминаниями, навеянными пожелтевшими фотографиями из семейных альбомов.

Рецепты красоты от Ирэн

Грейпфрукт для ваших волос

В косметике для волос используется сок, мякоть и кожура плодов грейпфрукта. Я хочу предложить несколько рецептов для различных типов волос.

1. Для жирных волос.

Возьмите один большой плод грейпфрукта, натрите его на тёрке. Полученную кашицу положите в керамическую посуду и добавьте 1/4 теплой минеральной воды. Всё тщательно перемешайте. Нанести на кожу головы, а также на волосы по всей длине. Поверх повяжите косынку, через 30-40 мин вымойте волосы мягким шампунем для жирных волос; затем ополосните подкисленной водой (1 чайн. ложка столового или яблочного уксуса).

2. Если ваши волосы сухие, им поможет следующая маска. Взбейте 2 яичных желтка, отдельно натрите на тёрке один грейпфрукт. Всё это перемешать и добавить 1 стол. ложку растительного масла и 1 стол. ложку сметаны. Затем размочите небольшой кусочек мякиша чёрного (ржаного) хлеба в двух столовых ложках молока. Перемешайте всё с ранее полученной массой. Нанесите всё это на волосы и их корни, замотайте голову махровым полотенцем. Через 40-50 мин вымойте голову.

3. Для нормальных волос.

Возьмите очищенный от корки грейпфрукт, натрите на тёрке. Отдельно взбейте 1 яйцо и добавьте 1 стол. ложку жирных сливок.Полученные ингредиенты тщательно перемешать. Распределить всю кашицу на кожу головы и по всей длине волос. Поверх одеть полиэтиленовый пакет, а сверху повязать полотенцем. Через 40 мин. вымыть шампунем, а затем ополоснуть подкислённой чайной заваркой(1 ч. ложка лимонной кислоты на тазик воды с 1 стаканом заварки).

Девушки, не поленитесь, сделайте эту маску! Эффект просто потрясающий: волосы приобретают эластичность и здоровый вид!

Рецепт от Петровны

"Гнездышки"

1) Взять 800-1000 гр. фарша. Смешать его с 3-мя мелко порубленными луковицами, 1 яйцом. Добавить соль, перец по вкусу и 2 ст. ложки рубленной зелени (любой).

2) Из фарша вылепить котлеты, в каждой из которых с одной стороны сделать углубление. Котлеты обжарить снизу и выложить на смазанный противень.

3) 3-4 крупных помидора и 150 г. сыра нарезать мелкими кубиками. Смешать.

4) Положить смесь сыра с помидорами в углубления на котлетах. Поставить противень в духовку и запекать 10-15 минут, чтобы сыр полностью расплавился.



5) Готовые котлеты перед подачей на стол посыпать рубленой зеленью.

Домашний доктор

Как ребёнку дать лекарство?

Иногда можно только хитростью заставить ребёнка выпить лекарство.

Первое правило: дайте ему лекарство как бы между прочим, как будто вам и в голову не пришло, что он может отказаться его принимать. Если у вас будет неуверенный вид или вы будете подробно объясняться с ребёнком, он поймёт, что от него ждут отказа принимать лекарство. Говорите с ним о чём-нибудь другом, вливая лекарство в рот. Большинство детей автоматически открывают рот при приближающейся ложке.

Нерастворимые таблетки можно измельчить и смешать с вкусной едой, например, яблочным пюре. Горькие таблетки можно смешивать с чайной ложкой сладкой воды, мёда, варенья. Глазные капли и мази можно вводить во время сна.

Смешивая лекарства с напитками, лучше использовать такие, которые ребёнок пьёт редко. Если вы придадите странный вкус молоку или соку, ребёнок долго будет относится к ним с подозрением.

Будьте здоровы!

Кулинарные советы

Мясной фарш

Мясной фарш не будет прилипать к бумаге, если его вместе с упаковкой положить на непродолжительное время в холодную воду.

Если у вас в холодильнике не оказалось яиц, которые вы хотели добавить в фарш для котлет, то их можно заменить картофельным крахмалом (1/2 ст.ложки на 250 г мясного фарша).

Для приготовления котлет лучше использовать чёрствый некислый пшеничный хлеб. Свежий хлеб даёт больше клейковины - котлетная масса становится тягучей.

Расписание работы слуцких библиотек

Городская централизованная библиотечная система

им.Н.К.Крупской (ул.Копыльская, 2, тел. 537-74)

Читальный зал работает *(тел. 557-72):* с 10 до 19 часов *без обеда*
Абонемент взрослый *(тел. 542-10):* с 10 до 19 часов *без обеда*
Выходной - понедельник
Абонемент детский *(тел. 452-05):* с 10 до 18 часов, *обед с 13 до 14 часов, выходной* – воскресенье.

Филиал №1

(Дом культуры сахарного комбината, тел. 583-71)

Время работы: с 11 до 19 часов
Обед: с 14 до 15 часов
Выходной - воскресенье, понедельник

Филиал №2

(Центр досуга, ул.Социалистическая, тел. 424-69)

Время работы: с 10 до 19 часов
Обед: с 13 до 14 часов
Выходной - суббота, воскресенье

АСБ "Беларусбанк" информирует:

С 1 июля 2000 года для улучшения качества обслуживания пенсионеров города Слуцка и Слуцкого района введён новый вид вклада "Пенсионный", по которому установлена процентная ставка в размере 3-х кратной ставки вклада "до востребования" - 27% годовых. Все ранее открытые счета на получение пенсий автомотически переведены в разряд пенсионного вклада.

Все операции по вкладу совершаются на условиях вклада "до востребования", т.е. кроме сумм пенсий на этот вклад Вам могут поступать любые суммы дополнительных взносов и безналичных перечислений.

Отделения филиала возобновили оформление доверенностей на получение денежных средств со вкладов в отделениях и теперь жителям города и района больше не придётся тратить своё время, простаивая в очередях нотариальной конторы или домоуправления.

Страницу подготовила Юлия Гончаренко

Опрос

Дожди и настроения

Мы воспользовались небольшим перерывом между потоками воды с небес и вышли на улицу. „Доставляют ли вам неприятности нынешние дожди?" - такой вопрос нас интересовал.



Дима, *газоэлектросварщик:*
-Неприятностей абсолютно никаких. Огорода нет. Только крышу заливает. Потекла, в углу есть пятно. Две недели назад обещали начать капитальный ремонт крыши - ждём.



Оля, *временно не работающая:*
- Какие неприятности из-за дождей? Да вот в наш огородный участок не влезть. Затопило. Прополки валом, работы валом. И из-за дождей заболела, вот из поликлиники иду.



Ирина Аркадьевна Шутик, *в декретном отпуске:*
- Настроение плохое из-за дождей. Невозможно с ребёнком на прогулку сходить на улицу, а ведь это же лето. У меня свой дом, огород. И в огороде много травы.

Улыбнёмся?!

Бригадир отчитывает тракториста:
- Я же тебя вчера просил: не пей больше!
- А я больше и не пил: выпил столько же, сколько вчера.

***

- Какая разница между заплатой и зарплатой?
- Заплата больше дырки, а зарплата меньше.

***

Стоят беларус с поляком у границы, каждый на своей стороне, и думают, как бы досадить друг другу.
- Эй, бульбаш, а у вас сахара нет!
- А у вас правительство плохое!
- А тогда мы у вас Президента украдём!
- А тогда у вас тоже сахара не будет!

***

- Что это такое: маленькое, зелёненькое, хрустит, а не деньги?
- Сто рублей.

***

